**УДК 94(476)**

# КЛАСІФІКАЦЫЯ ПРАВАВЫХ РЭФОРМ У ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

**А. Я. Ігнатовіч**
Магілёўскі інстытут МУС Рэспублікі Беларусь,
дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

***Анатацыя.*** *Разглядаюцца розныя класіфікацыі прававых рэформ на прыкладах гісторыі беларускай дзяржаўнасці.*

***Ключавыя словы:*** *прававыя рэформы, класіфікацыя, беларуская дзяржаўнасць.*

***Annotation.*** *Various classifications of legal reforms are considered using examples from the history of Belarusian statehood.*

***Keywords:*** *legal reforms, classification, Belarusian statehood.*

У сувязі з неабходнасцю адпавядаць патрабаванням у канкрэтны гістарычны перыяд прававая сістэма павінна пастаянна ўдасканальвацца. Дзяржава як стрыжнёвы элемент палітычнай сістэмы заклікана аказваць непасрэдны ўплыў на развіццё права. Прававая рэформа з’яўляецца глабальным працэсам змен прававой сістэмы, мэты і вынікі якога могуць змяняцца ў далейшым. А сістэмнасць права пастаянна абумоўлівае ўзгадненне вынікаў асобных змяненняў у сістэме права. Мэта артыкула — класіфікаваць прававыя рэформы ў гісторыі беларускай дзяржаўнасці.

Першая магчымая класіфікацыя — прававыя рэформы, накіраваныя на забеспячэнне пераўтварэнняў у іншых сферах жыцця (палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай і г. д.), і рэформы, закліканыя змяніць саму прававую рэальнасць [1, с. 11]. Відавочна, што першы з’яўляецца больш распаўсюджаным варыянтам: права ў гэтым выпадку выступае інструментам, які забяспечвае правядзенне палітычных, эканамічных, сацыяльных і іншых рэформ. Думаецца, што прыкладам з’яўляюцца пераўтварэнні, якія адбыліся ў перыяд станаўлення незалежнай Рэспублікі Беларусь. У сувязі з гэтым важна адзначыць, што юрыдычная сфера мае сваю логіку. Першапачатковая задача ажыццяўлення рэформы сістэмы права — гэта прыняцце новага Асноўнага Закона. Менавіта Канстытуцыя заклікана ўстанавіць прынцыпы права, дзяржавы, усяго грамадства, узаемаадносіны асобы з дзяржавай і г. д. І толькі пасля прыняцця новай Канстытуцыі лагічна змяняць астатнія законы. Таксама можна, як адзначаюць даследчыкі права, рэфармаваць састарэлыя законы з апераджальным або паралельным змяненнем некаторых канстытуцыйных палажэнняў, якім не адпавядаюць новыя законы. У гісторыі беларускай дзяржаўнасці на пачатку 1990-х гг. быў рэалізаваны свой шлях фарміравання новай прававой сістэмы. Згодна

з Канцэпцыяй судова-прававой рэформы (1992 г.), галоўнымі яе мэтамі сталі: стварэнне прававой сістэмы, здольнай забяспечыць функцыянаванне прававой дзяржавы; зацвярджэнне самастойнай і незалежнай судовай улады як асноўнага гаранта правоў і свабод грамадзян і іншых удзельнікаў праваадносін; увасабленне ў заканадаўстве дэмакратычных прынцыпаў арганізацыі і дзейнасці праваахоўных органаў, якія адпавядаюць агульнапрызнаным нормам міжнароднага права і навуковым рэкамендацыям [2]. 15 сакавіка 1994 г. была прынята Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, якая абвясціла нашу рэспубліку ўнітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай. Прыняцце новай Канстытуцыі, уцягванне Рэспублікі Беларусь у сусветную супольнасць як суверэннай і незалежнай дзяржавы прывялі да значных змен ў заканадаўстве. Адным з найважнейшых новаўвядзенняў Канстытуцыі стала вызначэнне сістэмы прыярытэтаў дзяржавы: на першае месца ставіцца чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі. Прыняцце 24 лістапада 1996 г. новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь пацягнула за сабой істотнае пераразмеркаванне паўнамоцтваў паміж дзяржаўнымі органамі. Была таксама актывізавана работа, накіраваная на вырашэнне найскладанейшых задач па фарміраванні новай прававой сістэмы, закліканай забяспечыць устойлівае развіццё эканомікі, эфектыўнае функцыянаванне дэмакратычных інстытутаў. На кіраўніка дзяржавы былі ўскладзены функцыі гаранта Канстытуцыі, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, забеспячэння пасрэдніцтва паміж органамі дзяржаўнай улады, іх пераемнасці і ўзаемадзеяння. У мэтах перспектыўнага вырашэння актуальных праблем функцыянавання нацыянальнай прававой сістэмы ў 2002 г. была адобрана Канцэпцыя ўдасканалення заканадаўства Рэспублікі Беларусь [3]. Значныя змены ў Асноўны Закон унесены па выніках рэспубліканскага рэферэндуму 27 лютага 2022 г. [4]. Падвергліся зменам прэамбула, 85 артыкулаў, з якіх 2 страцілі сілу, з’явілася 11 новых артыкулаў. Нягледзячы на вялікі аб’ём і скразны характар змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі, яна не выкладаецца ў новай рэдакцыі, што падкрэслівае канстытуцыйна-прававую пераемнасць у асновах канстытуцыйнага ладу, у характары ўзаемаадносін асобы, грамадства і дзяржавы, а таксама ў захаванні моцнай прэзідэнцкай улады.

Другая класіфікацыя прававых рэформ — завершаныя і незавершаныя рэформы [1, с. 13]. Мы пераканаліся на папярэднім прыкладзе, што практычна ніводная рэформа не можа быць аднаразовым дзеяннем. Яна аб’ектыўна прадугледжвае паступовасць, паэтапнасць, комплекснасць пераўтварэнняў. Пры гэтым ёсць і выключэнні. Яскравым прыкладам незавершанасці прававых пераўтварэнняў з-за слабасці дзяржавы з’яўляюцца падзеі ў Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст. Так, у Канстытуцыі 3 мая 1791 г. знайшлі адлюстраванне ідэя суверэнітэту народа, прынцыпы вяршэнства закона, падзелу ўлад [5].

Але няздольнасць улад Рэчы Паспалітай забяспечыць стабільнасць развіцця і парадак у абедзвюх яе частках — Вялікім Княстве Літоўскім (далей — ВКЛ) і Польшчы — прывяла ў канчатковым выніку да трох падзелаў гэтай дзяржавы.

Магчымы таксама варыянт і з контррэформамі, калі ўзнікае ўсведамленне пастаўленай мэты як памылковай, непрымальнай для краіны ў сілу існуючых традыцыйных адносін, звычаяў, асаблівасцей развіцця або прызнання недастатковай падрыхтоўкі рэформы, вынікі якой прынялі непрадказальны характар [1, с. 14]. Прыкладам, у тым ліку і ў адносінах да беларускіх зямель, з'яўляюцца контррэформы Аляксандра III, якія сталі рэакцыяй на ўздым рэвалюцыйнага руху пасля адмены прыгоннага права.

Трэцяя магчымая класіфікацыя — зыходзячы з мэты прававой рэформы [1, с. 15]. Можна вылучыць дзве глабальныя мэты. Першая — паляпшэнне жыцця грамадства ў цэлым і кожнага яго члена. Так, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка адзначаў: «Наше белорусское государство существует с 1 января 1919 года, со времени образования БССР. Белорусский народ… выбрал и поддержал именно то государство, которое провозгласило важнейшим принципом социальную справедливость, защиту прав тружеников и равенство наций» [6]. Пераемніцай менавіта такой прававой традыцыі з'яўляецца Рэспубліка Беларусь. Іншы варыянт — у цэнтры рэформы знаходзяцца інтарэсы асобнага саслоўя, класа або народа. Так, Люблінская унія 1569 г., па вызначэнні першага Прэзідэнта Акадэміі навук БССР, вядомага беларускага гісторыка У. М. Ігнатоўскага, «шырока адчыніла браму для польскага ўплыву» [7, с. 115]. Напрыклад, у 1696 г. польскія ўлады пастанавілі, каб у справаводстве ВКЛ усе рашэнні складаліся толькі на польскай мове. Старабеларуская мова была забаронена. У сувязі з гэтым важна, што ўключэнне ў склад Расійскай Імперыі мела для беларускага этнасу выратавальны характар: была ліквідавана шляхецкая анархія, ад якой пакутаваў найперш просты беларускі народ.

Такім чынам, стварыць тыпалогію прававых рэформ у гісторыі беларускай дзяржаўнасці цяжка па многіх прычынах. Гэта і наяўнасць вялікай колькасці крытэрыяў для класіфікацыі, і абмежаванасць кожнага асобнага падыходу, і той факт, што беларускія землі ў розныя гістарычныя перыяды ўваходзілі ў склад розных дзяржаў. Варта адзначыць, што прававыя рэформы забяспечваюць прагрэсіўныя пераўтварэнні ва ўсіх сферах грамадскага жыцця і праводзяцца ў мэтах пабудовы ўзгодненай несупярэчлівай сістэмы права і вызначэння шляхоў далейшага развіцця дзяржавы. Сёння можна з упэўненасцю сказаць, што ў нашай краіне створаны трывалы фундамент для далейшага развіцця права.

1. Дорская А. А. Типология правовых реформ // Вестн. РГГУ. Сер. Экономика. Управление. Право. 2015. № 2. С. 11–22. Вернуться к статье

2. О Концепции судебно-правовой реформы [Электронный ресурс] : постановление Верхов. Совета Респ. Беларусь от 23 апр. 1992 г. № 1611-XII. Доступ из информ.-поисковой системы «ЭТАЛОН». Вернуться к статье

3. О Концепции совершенствования законодательства Республики Беларусь [Электронный ресурс] : Указ Президента Респ. Беларусь от 10 апр. 2002 г. № 205. Доступ из информ.-поисковой системы «ЭТАЛОН». Вернуться к статье

4. Конституция Республики Беларусь 1994 года [Электронный ресурс] : с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 нояб. 1996 г., 17 окт. 2004 г. и 27 февр. 2022 г. Доступ из информ.-поисковой системы «ЭТАЛОН». Вернуться к статье

5. Канстытуцыя Рэчы Паспалітай 3 мая 1791 г. («Ustawa Rzadowa») [Электронный ресурс] // Нац. правовой Интернет-портал Респ. Беларусь : [сайт]. URL: https://pravo.by/pravovaya-informatsiya/pomniki-gistoryi-prava-belarusi/kanstytutsyynae-prava-belarusi/akty-rechy-paspalitay/kanstytutsyya-rechy-paspalitay-3-maya-1791-g-ustawa-rzadowa-/ (дата обращения: 09.02.2025). Перейти к источнику Вернуться к статье

6. Лекция «Исторический выбор Республики Беларусь» в БГУ [Электронный ресурс] // Пресс-служба Президента Республики Беларусь : [сайт]. URL: https://president.gov.by/ru/events/lektsija-istoricheskij-vybor-respubliki-belarus-v-bgu-5819 (дата обращения: 09.02.2025). Перейти к источнику Вернуться к статье

7. Ігнатоўскі У. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. 5-е выд. Мінск : Беларусь, 1992. 190 с. Вернуться к статье